*З 4 па 8 снежня на філалагічным факультэце нашай альма-матар прайшоў традыцыйны Фестываль беларускага слова, у межах якога былі арганізаваны шматлікія мерапрыемствы: выстава дапаможнікаў, падручнікаў, метадычных рэкамендацый выкладчыкаў кафедры беларускага мовазнаўства, літаратурная гасцёўня «У вянок песняру», кінапрагляд навукова-папулярнага фільма «"Я – падарожнік у часе". Якуб Колас: паэт і чалавек», сустрэча «Маналогі: пятля часу» ў НАДТ імя Якуба Коласа, імпрэзы «Слова – песня, слова – чары», «Пад гітару па-беларуску» і многія іншыя. Больш падрабязна пра некаторыя з іх распавядаюць нашыя пазаштатныя карэспандэнты.*

# ПАМЯТАЦЬ – НЕЛЬГА ЗАБЫЦЬ

У межах Фестывалю беларускага слова студэнты і выкладчыкі філалагічнага факультэта наведалі Нацыянальны акадэмічны драматычны тэатр імя Якуба Коласа. А нагодай стаў майстар-клас «Маналогі: пятля часу» доктара мастацтвазнаўства нашага ўніверсітэта Таццяны Катовіч і мастацкага кіраўніка тэатра Міхася Краснабаева. Сустрэча на эксперыментальнай сцэне доўжылася больш за гадзіну. Таццяна Віктараўна і Міхась Дзмітрыевіч неаднаразова ўзгадвалі такія знакавыя для беларускай літаратуры і мастацтва імёны, як Якуб Колас, Марк Шагал, Юдэль Пэн, Хаім Суцін, дзякуючы якім Віцебск і Беларусь ведаюць ва ўсім свеце.

Асаблівую ўвагу госці звярнулі на асобу У. Караткевіча, творы якога неаднаразова ставіліся на коласаўскай сцэне. Асабіста мяне ўразіла незвычайнае параўнанне Т. Катовіч: мова Уладзіміра Караткевіча ў мастацтвазнаўца асацыюецца з мядовым струменьчыкам. Прыемна здзівіў і той факт, што, каб вывучыць беларускую мову, Таццяна Віктараўна чытала творы нашага земляка. На маю думку, гэта сведчыць пра значнасць творцы не толькі ў літаратуры, але і ў жыцці асобных людзей.

Мастацкі кіраўнік тэатра прачытаў урывак з аповесці У. Караткевіча «Ладдзя Роспачы», працытаваны ў манаграфіі Т. Катовіч «Мембраны: петлі часу». Далёка не кожны чалавек можа так глыбока прасякнуцца творчасцю пісьменніка: Міхась Дзмітрыевіч чытаў тэкст, і з яго вачэй цяклі слёзы. У такія хвіліны разумееш, наколькі важна спасцігнуць глыбіню твора: правільна ўспрыняць словы аўтара і адчуць яго настрой.

Загадчык літаратурна-драматычнай часткі тэатра Алесь Замкоўскі зазначыў, што, каб гаварыць пра Уладзіміра Караткевіча, трэба чытаць яго кнігі. Бо як мы можам гаварыць, а тым больш разважаць пра творчасць пісьменніка, калі не чытаем, не імкнёмся зразумець сутнасць яго твораў. У заключэнне тэатральны крытык Юрась Іваноўскі падкрэсліў вялікае значэнне творчасці У. Караткевіча для развіцця нацыянальнай культуры, у тым ліку тэатральнага мастацтва.

**Алеся ВАРКУЛЕВІЧ,**
**студэнтка 2 курса ФлФ.**